*Захарына Ю. Ю.*

# РЭАЛЬНАСЦЬ ЦІ ІЛЮЗІЯ: ВОБРАЗ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ГОРАДА

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка*

*(Пастуціў у рэдакцыю 30.06.2017)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вобраз сучаснага горада стаў вынікам асэнсавання тэхналагічнага прагрэсу, выкарыстання яго набыткаў у сферы архітэктурна-праекціровачнай і будаўнічай дзейнасці. Інфармацыйная эпоха вызначыла новыя сацыяльныя прыярытэты, якія пацягнулі за сабой пераасэнсаванне мастацкіх каштоўнасцей, што склаліся на працягу гістарычнай эвалюцыі. Пашырэнне межаў творчасці, з'яўленне ў ёй новых відаў, форм, тэхнік адкрылі невядомыя раней магчымасці інтэрпрэтацыі мастацкай карціны свету. Эксперыменты дойлідаў, дызайнераў, мастакоў сталі магчымымі для рэалізацыі ў рэчаіснасці ў многім дзякуючы тэхналагічнаму «прарыву» постіндустрыяльнай эпохі.

Архітэктура сучаснага горада быццам схавалася пад «маскай» люстраных экранаў, лічбавых табло, здольных дэматэрыялізаваць рэальную прастору. Незалежна ад рэгіёна (ЗША, Еўропа, Азія) мастацкія вобразы мегаполісаў і вялікіх гарадоў паглынула «хваля новай прыгажосці». Яе характэрнымі рысамі сталі недаказанасць, размытасць, ілюзорнасць.

З 1990-х гадоў у сусветнай архітэктурна-праекціровачнай практыцы з'явіліся і атрымалі распаўсюджванне новыя канцэпцыі дойлідства, заснаваныя на эксперыментатарстве ў формаўтварэнні. Гэтаму садзейнічалі і камп'ютарныя тэхналогіі, якія адкрылі невядомыя раней магчымасці стварэння віртуальных вобразаў. Экстравагантныя, мудрагелістыя архітэктурныя формы, што нядаўна існавалі толькі ў нашых ўяўленнях, набылі вітальную энергію. Абумоўленыя парадыгмай нелінейнасці, архітэктурныя формы рэпрэзентавалі новыя сацыяльныя каштоўнасці: свабоду творчасці, фантазіі, уяўлення. «Сэнс нелінейных касмагенных вопытаў архітэктуры – прыблізіцца да прыродных з'яў, да "паводзінаў" прыродных сістэм, часам парадаксальных і непрадказальных», – слушна адзначае расійская мастацтвазнаўца І. Дабрыцына [1, с. 202 – 203].

У эстэтыцы дойлідства XXI ст. сцвердзіліся ідэі дынамічнасці і трансфармацыі мастацкіх вобразаў, што ўспрымаюцца ў руху. Камп'ютарныя і тэлекамунікацыйныя тэхналогіі, якія ўвайшлі ў штодзённае жыццё соцыуму, змянілі візуальнае адчуванне чалавекам гарадской прасторы. Як сцвярджае аўстралійскі медыятэарэтык С. Макуайр, «медыя – неад'емны элемент сучаснага ўрбанізму, у якім бачаць вырашэнне крызісу гарадоў. Пры гэтым медыя актыўна падрываюць традыцыйныя рэжымы прасторы і часу» [2, с. 17].

У сучасную эпоху гарадское асяроддзе стала ўспрымацца па-новаму. Усё, што раней было ў ім матэрыяльным, «стала дэматэрыялізаваным з дапамогай экранных выяў, штучнага асвятлення, пластычнай сінтэтыкі і адлюстраванай паверхні» [3, с. 337]. Эксперыменты ў галіне архітэктурнага формаўтварэння, падкрэслівае А. Шамрук, «арыентуюцца сёння на канцэпты нераўнавагі, самаарганізацыі, на разрыў з прынцыпамі класічнай эстэтыкі, традыцыйным разуменнем архітэктурнага твора, на матэрыялізацыю такіх катэгорый, як тэкстуальнасць, дэструктуралізацыя, дэкампазіцыя, дыскурсіўнасць, інтэрактыўнасць, нявызначанасць (прасторавая, часавая, знакавая)» [4, с. 44].

Гарадская прастора, што бесперапынна змяняецца, трансфармуецца пад уплывам сацыяльных патрабаванняў часу. У кожным горадзе ўвасабляюцца ў рэчаіснасць тыя мастацкія задумы, што карэліруюць з падрыхтаванасцю жыхароў да ўспрымання новых ідэй. У залежнасці ад прыродна-кліматычных умоў, гістарычных традыцый горада, менталітэта насельніцтва ў пераўладкаванні гарадскога асяроддзя атрымліваюць падтрымку апрабаваныя часам наватарскія прынцыпы і прыёмы прасторавай арганізацыі, што адпавядаюць «духу часу».

Асаблівасці мастацкага мыслення творцаў эпохі, іх здольнасць да ўспрымання і асэнсавання класічных і неардынарных мастацкіх форм, прыёмаў ствараюць глебу для культывавання арыгінальных ідэй, вобразаў. У сучасны перыяд, які характарызуецца пазіцыяніраваннем арыгінальных мастацкіх вобразаў, народжаных у эксперыментальнай дзейнасці, роля творцы (дойліда, дызайнера, мастака) усё больш узрастае. Відавочным становіцца вобразнае выражэнне ў мастацкіх творах аўтарскага почырка, творчай манеры. Але ў гарадской прасторы побач з гістарычнымі пабудовамі, тыпавой забудовай, дызайнерскімі кампазіцыямі аўтарскія архітэктурныя праекты ўключаюцца ў адзіны кантэнт. У гэтым інфармацыйным полі пазіцыяніруюцца мастацкія вобразы гісторыі і сучаснасці, класічныя і эксцэнтрычныя, нерухомыя і медыйныя, што ўступаюць у палілог паміж сабой. Адны з іх дамінуюць над сфарміраванай забудовай, іншыя «раствараюцца» ў асяроддзі. У працэсе кінетычнага ўспрымання, якому падвержана ў большай ступені архітэктура вялікіх і буйных гарадоў, мастацкія вобразы змяняюць адзін аднаго, фарміруючы на аснове эмацыянальна-пачуццёвых ураджанняў зборны вобраз горада, яго агульную карціну.

Усведамленне мастацкага вобраза горада адбываецца зыходзячы з ацэнкі каштоўнасцей асяроддзя, якое ўспрымаецца як кінетычна, так і статычна. Так, дынамічная змена «кадраў» падчас руху на аўтатранспарце дае лінейнае ўяўленне пра вобраз горада. З гарадской прасторы «выхопліваюцца» найбольш яркія, выразныя, незвычайныя аб'екты. Пры такім успрыманні першаснае значэнне маюць колер, фактура, форма, кампазіцыя архітэктурных будынкаў, іх размяшчэнне ў прасторы горада. Вышынныя кропкі горада інтэрпрэтуюцца як дамінанты асяроддзя, што фарміруюць яго сілуэт.

Усведамленне вобраза горада ў дынамічным руху спараджае сінтэтычную ацэнку яго мастацкіх якасцей. У вызначэнні мастацка-вобразнай годнасці гарадскога асяроддзя, ацэнцы яго адпаведнасці «духу часу», «духу месца» важную ролю адыгрывае эмацыянальны кампанент. У дадзеным кантэксце ўпарадкаванасць забудовы, якая лічыцца ідэальным прынцыпам арганізацыі гарадской прасторы, не раскрывае мастацка-вобразнай адметнасці гарадоў, не выклікае яркіх эмоцый. У ёй няма дынамікі, якая суаднасілася б з рытмам жыцця сучасных гараджан.

Эмацыянальнай ацэнкі гарадской прасторы не дае аднатыповая забудова. Эмоцыі нараджае эфект нечаканасці. Значным фактарам ацэнкі мастацкай адметнасці гарадскога асяроддзя выступае выпадковасць. Непрадказальнасць, эфект «выбуху» ці «стрэлу», якія ствараюць, здавалася б, неапраўданыя для асяроддзя вобразы архітэктуры, служаць крытэрыем візуальнай неўпарадкаванасці забудовы, ілюзорнага разбурэння яе цэласнасці. Але менавіта гэтае «драбленне» прасторы на дыскрэтныя элементы прыцягвае ўвагу, вабіць стаць саўдзельнікам творчага працэсу мадэліравання адсутных фрагментаў асяроддзя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У дынамічным ўспрыманні гарадской прасторы важнае значэнне мае месца размяшчэння яркіх па вобразнай напоўненасці, выразных архітэктурных аб’ектаў. Калі збудаванне пры руху на аўтатранспарце адносна доўгі час трапляе ў поле зроку (праглядаецца ў прасвеце вуліцы, дамінуе па маштабе, вышыні над забудовай, узведзены на адкрытай прасторы), то эмацыянальны водгук на яго больш устойлівы. У рэцыпіента ёсць магчымасць усвядоміць яго мастацкую каштоўнасць: суаднесці з асяроддзем, ацаніць архітэктурную форму, кампазіцыю, дэталі. Такія аб’екты з’яўляюцца вызначальнымі ў сінтэзаваным уяўленні аб вобразе горада. Кароткачасовае «знаёмства» нават з прэтэнцыёзнымі вобразамі архітэктуры ў гарадскім асяроддзі дае паверхневае, эмацыянальна няўстойлівае ўяўленне пра іх, хоць такія аб’екты з’яўляюцца ключавымі ў інтэрпрэтацыі вобраза горада.

Большасць сучасных гарадоў, у тым ліку і беларускіх, уключае шматлікія кварталы аднатыповай забудовы, жылыя раёны, пазбаўленыя яркіх эмацыянальных акцэнтаў. Яны не з’яўляюцца дамінантамі ў вызначэнні вобраза сучаснага горада. У цэлым, раёны аднатыповай забудовы нейтральныя для кінетычнага ўспрымання. Але яны выступаюць структурнымі кампанентамі гарадской прасторы, з якіх складаецца вобраз горада ў цэлым. Іх мастацка-вобразнае асэнсаванне здзяйсняецца на іншым узроўні – з фіксаваных кропак.

Пры статычным успрыманні (на ўзроўні пешахода) раскрываюцца іншыя грані мастацкага вобраза горада. З нізкіх кропак ствараецца магчымасць не толькі дэталёвага агляду асобных пабудоў і іх груп, але і тактыльнага іх успрымання. Мернасць у асэнсаванні мастацкіх каштоўнасцей архітэктуры дазваляе ў большай ступені адчуць асяроддзе. У большасці буйных сучасных гарадоў дзякуючы арганізацыі аглядавых пляцовак на вышынных аб’ектах адкрылася магчымасць кампазіцыйнага ўспрымання гарадской прасторы, што сумяшчае кінетычны і статычны аспекты. Панарамны позірк на гарадскі пейзаж з аглядавых пляцовак хоць і з’яўляецца няпоўным, але на аснове сінтэзаваных фрагментаў стварае агульнае ўяўленне аб гарадской прасторы.

Вобраз гарадоў са шматвяковай гісторыяй і адносна маладых гарадоў значна адрозніваецца паміж сабой. У першым выпадку сучасная архітэктура «ўкрапваецца» ў наяўнае асяроддзе на ўзроўні асобных аб’ектаў, размешчаных уздоўж вуліцы ці групамі, або асобных раёнаў новай забудовы (у тым ліку дзелавых раёнаў «сіці»). Часта з’яўленне сучасных будынкаў не ўзгадняецца з гістарычна сфарміраваным асяроддзем. Яны вядуць дыялог ці ўступаюць у палеміку з вобразамі архітэктуры папярэдніх эпох, дэманструючы сваю веліч, «магутнасць», выціскаючы сваіх «папярэднікаў». Часам у гэтым дыялогу прасочваецца агульная мастацкая ніць – маштабная, рытмічная, элементарная (выражаецца ў элементах). У такім выпадку сучасная архітэктура выступае сродкам кантынуальнасці гістарычных мастацкіх каштоўнасцей, увасобленых у вобразах. Яна гарманічна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

уключаецца ў кантэкст асяроддзя, тактоўна ўносячы ў яго новае мастацка-вобразнае адценне.

Для адносна маладых гарадоў (Бангкок, Дубай) у большай ступені характэрна камплементарнасць аб'ектаў сучаснай архітэктуры ў асяроддзі. Архітэктурныя аб'екты нароўні камунікуюць паміж сабой. Яны гарманічна суадносяцца адзін з адным, ствараючы аднароднае ў стылявым плане асяроддзе. У такім выпадку нават уяўленне аб адным з цэнтральных фрагментаў гарадскога пейзажу нараджае іканаграфічны вобраз горада.

Вобраз кожнага горада індывідуальны. Яго непаўторнасць вызначаецца падыходамі да горадабудаўнічай канцэпцыі асяроддзя, а таксама рэалізацыяй творчых задум дойлідаў. Прасторавая арганізацыя горада выступае дэнататыўным крытэрыем яго мастацка-вобразнай адметнасці.

У фарміраванні вобразаў сучасных гарадоў Беларусі знайшоў адлюстраванне прынцып пераемнасці ландшафтна-тэрытарыяльнага асваення прасторы, перададзены ў стварэнні рукатворнага ландшафту з развітой сістэмай рэк, ручаёў. Валодаючы ўласцівасцямі адбіваць навакольнае асяроддзе, падобна люстэрку, водная сістэма (напрыклад, Мінска) зрокава пашырае межы прасторы горада. Яна стварае ілюзію ўяўнага свету, што паўтарае фрагменты гарадскога пейзажу ў некалькі скажоным выглядзе. Адбіваючыся ў воднай гладзі, сучасная забудова ў спалучэнні з зялёнымі насаджэннямі стварае калейдаскоп з фрагментаў гарадскога пейзажу, якія, падобна да кадраў кінастужкі, змяняюцца, спараджаючы кінетычны эфект. Пры статыцы манументальных форм архітэктуры актыўнае выкарыстанне прыродна-ландшафтных асаблівасцей стварае ўмову заўсёднай трансфармацыі мастацка-вобразных характарыстык забудовы. Яны змяняюцца ў залежнасці ад часоў сутак, пор года, надаючы нават малавыразнай архітэктуры яскравыя мастацка-вобразныя якасці.

Выкарыстанне прыродна-ландшафтных асаблівасцей як сродку мастацкай выразнасці ў мадэляванні вобраза горада выступае адным з аспектаў, што задае адметнасць гарадскога асяроддзя Беларусі. Актыўнае ўжыванне шкла ў архітэктуры вялікіх гарадоў, здольнага трансфармаваць матэрыяльныя межы пабудоў, з'яўляецца агульнай тэндэнцыяй, што пад уплывам глабалізацыі культуры атрымала распаўсюджванне ў большасці вялікіх гарадоў свету.

Выкарыстанне шкла ў архітэктуры дзякуючы яго ўласцівасцям адлюстравання святла і навакольнага свету спрыяла дасягненню гармоніі з асяроддзем [5]. Люстраное шкло, якое ўвайшло ў сістэму сродкаў мастацкай выразнасці архітэктуры, дзякуючы своеасабліваму «адлюстраванаму пранікканню» ў розных умовах дазволіла стварыць свае эфекты ўспрымання [6, с. 243]. У адным выпадку вялікі шкляны экран партала збудавання, напрыклад, дае ілюзію глыбіні прасторы, дзе бачыцца фантастычны горад, што існуе толькі ў нашым уяўленні (збудаванне Лядовага палаца ў Гомелі, 1998 г., арх. І. Боўт, С. Міцько з удзелам Л. Смольскай, Н. Шамелавай, А. Грачова). У другім – плаўныя абрысы паўпразрыстага аб'ёму надалі эфект

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прасторавай нявызначанасці межаў масы (будынак офіса кампаніі «Zepter» на перакрыжаванні вул. Няміга і Раманаўская Слабада ў Мінску, пачатак 2000-х гг., арх. А. Цэйтлін). У трэцім – пластычныя, «абцякальныя» формы шкляной пабудовы адлюстравалі ідэю свабоднага плана з «пералівам» прасторы (будынак комплексу «Аляксандраў пасаж» на перакрыжаванні прасп. Незалежнасці і вул. Філімонава ў Мінску, 2007 г., кіраўнік праекта – арх. Б. Школьнікаў). Але перцэптуальныя якасці архітэктурнай формы, у якой атрымалі ўвасабленне ідэі нявызначанасці межаў масы, дынамічнасці прасторы, яе шматпланавасці, у большасці не дазволілі аб'ектыўна суаднесці ўяўны і рэальны вобраз.

Архітэктурная форма, абрысы архітэктурнай прасторы не заўсёды прачытваюцца ва ўмовах асяроддзя. Лёгкія празрыстыя збудаванні з крыштальнай агранкай ствараюцца з выкарыстаннем таніраванага і люстранога шкла. Манументальнасць і падкрэсленая статыка аб'ёмаў губляюць сваё значэнне ў новых канструкцыях. Архітэктурная форма нібы раствараецца ў прасторы. Суцэльнае шкленне шматгранных аб'ёмаў у адбітках прамянёў сонца стварае гульню святла, ажыўляе вобраз, надае будынку новую эстэтычную афарбоўку. Тым не менш, актыўнае выкарыстанне шкла ў мадэліраванні мастацкіх вобразаў сучасных пабудоў спрыяла дыялагічнасці сфарміраванага матэрыяльнага асяроддзя горадоў і новай архітэктуры.

Інавацыйным сродкам пераўтварэння вобраза горада, што атрымаў распаўсюджванне ў Беларусі з 2000-х гадоў, стала медыя. Вялікія святлодыёдныя экраны з'явіліся не толькі атрыбутам культуры інфармацыйнай эпохі, але і адным з інструментаў мадэліравання прасторы вялікага горада. Разлічаныя на кінетычнае ўспрыманне, яны заклікаpast максімальна ярка выявіць і данесці інфармацыю да рэцыпіента ў кароткі час. Медыйныя экраны, устаноўленыя на перакрыжаваннях вуліц (Багдановіча і Машэрава, Прытыцкага і Лабанка ў Мінску), плошчах (Кастрычніцкая, Незалежнасці ў Мінску, Свабоды ў Віцебску, Леніна ў Брэсце, Цэнтральнай у Маладзечна і інш.), уздоўж буйных магістралей (па вул. Машэрава ў Брэсце), каля транспартных развязак (на перакрыжаванні МКАД і Лагойскага тракта – каля гандлёвага цэнтра «BIGZZ» у Мінску), выступаюць новымі акцэнтамі ў прасторы горада.

Медыяэкраны прываблiваюць яркімі колерамі, святлом, зменай кадраў візуальнай інфармацыі і ствараюць эфект глыбіні прасторы. Дынамічная змена малюнкаў спараджае візуальную трансфармацыю асяроддзя. У гэтай кінематаграфічнай гульні фарбаў, святла, малюнкаў архітэктурныя формы губляюць сваю сапраўднасць, «раствараюцца», «хаваюцца» ў ілюзорнай прасторы. Яны набываюць новыя якасці вобраза (нявызначанасць абрысаў масы, іх размытасць), удзельнічаюць у стварэнні інтэрактыўнага асяроддзя.

Сучасную гарадскую прастору нібы паглынулі святлодыёдныя экраны, адной з папулярных разнавіднасцей якіх стаў медыяфасад. Горад быццам ахінуўся новай «абалонкай», стала цяжка аддзяліць віртуальнае ад рэальнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сусветная практыка канструявання медыйных фасадаў накіравана пераважна не на раскрыццё мастацка-вобразных якасцей архітэктуры, а на распаўсюджванне рэкламы. Медыяфасады, устаноўленыя на будынках сталіцы Беларусі (гандлёва-забаўляльнага цэнтра «Арэна-Сіці», «Galleria Minsk»), як правіла, дэманструюць рэкламныя ролікі. Візуальныя змены архітэктурнай формы дае медыйнае аснашчэнне будынка Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску. Тут святлодыёдныя «дарожкі», што бягуць па фасадах, ствараюць эфект лёгкасці, паветранасці або, наадварот, трываласці, магутнасці архітэктурнай формы. У прасторы вячэрняга горада гэтыя мастацкія ілюзіі больш гарманічна ўзаемадзейнічаюць з асяроддзем, не парушаюць яе цэласнасці. Рэкламны ж характар медыя разбурае мастацкую вобразнасць архітэктуры.

У дынамічнай змене кадраў гарадскога пейзажу звычайныя формы, прыёмы арганізацыі гарадской прасторы страчваюць сваю моц. Яны становяцца няздольнымі спарадзіць яркі эмацыянальны водгук. У гэтых умовах упарадкаваная забудова, што валодае ўласцівасцю лагічна апраўданай мастацка-вобразнай кантынуальнасці, не задавальняе эстэтычныя патрабаванні грамадства да горада постіндустрыяльнай эпохі. Яна саступае месца «выпадковасці», ілюзорнаму разбурэнню цэласнасці асяроддзя. З апрабаванымі часам прынцыпамі прасторавай арганізацыі гарадоў, адлюстраванымі ў стварэнні цэласнага, гарманічнага асяроддзя на базе рукатворнага ландшафту з пакутовым раскрыццём маляўнічых панарам, уступаюць у дыялог новыя – кантраснага асяроддзя, здольнага здзівіць сваёй непрадказальнасцю. Архітэктурна-ландшафтнае асяроддзе пакутова губляе сваю «матэрыяльную абалонку», размываюцца межы рэальных і віртуальных абрысаў прасторы. У кантэксце мастацка-вобразнай інтэрпрэтацыі гарадская прастора становіцца візуальна незбалансаванай. Яна трансфармуецца ў бок ілюзорнасці.


**ЛІТАРАТУРА**

1. Добрицына, И. А. Нелинейная парадигма в архитектуре 90-х годов XX века / И. А. Добрицына // Вопросы теории архитектуры. Архитектурное сознание XX – XXI веков: разломы и переходы : сб. научных трудов / Рос. акад. арх-ры и строит. наук, Науч.-исслед. ин-т теории архитектуры и градостроительства ; под ред. И. А. Азизян. – М., 2001. – С. 146 – 206.
2. Маккуайр, С. Медийный город. Медиа, архитектура и городское пространство / С. Маккуайр ; пер. М. Коробочкина. – М. : Стрелка пресс, 2014. – 527 с.
3. Андреева, Е. Ю. Постмодернизм: искусство второй половины XX века – начала XXI века / Е. Ю. Андреева. – СПб. : Азбука-классика, 2007. – 488 с.
4. Шамрук, А. С. Традиция в проектных стратегиях современной архитектуры / А. С. Шамрук. – Минск : Белорусская наука, 2014. – 297 с.
5. Скоклеенко, А. Стекло и архитектура / А. Скоклеенко, С. Солодовников // Архитектура и строительство. – 2001. – № 2. – С. 42 – 43.
6. Железняк, О. Е. Пространство осознания современного города: реальность и «метафизика» / О. Е. Железняк // Вопросы теории архитектуры. Архитектурное сознание XX – XXI веков: разломы и переходы : сб. научных трудов / Рос. акад. арх-ры и строит.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наук, Науч.-исслед. ин-т теории архитектуры и градостроительства ; под ред. И. А. Азизян. – М., 2001. – С. 207 – 254.

РЕЗЮМЕ

Статья посвящена осмыслению роли новых технологий (медиа) в репрезентации образа современного белорусского города. Выявляются предпосылки трансформации городского пространства, породившие эффект визуальной дематериализации среды постиндустриального города. Доказывается, что медиа как средство формирования интерактивной среды в контексте организации городского пространства предопределяет «размытость», «стирание» границ иллюзорного и реального.

SUMMARY

The article is devoted to understanding the role of new technologies (media) in the representation of the image of the contemporary Belarussian city. It reveals the conditions of transformation of the urban space gave rise to the visual effect of the dematerialization of the post-industrial environment of the city. It is proved that the media as a means of forming an interactive environment in the context of arrangement urban space determines the «fuzziness», the «erasing» of borders is illusory and the real.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ